*А. А. Акушэвіч*
Рэспубліка Беларусь, Мінск

УДК 398+37.03

# АДУКАЦЫЙНАЯ КАЗКА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

*У артыкуле аналізуецца адукацыйная казка як мастацка-педагагічая з'ява, што ўзнікла ў выніку своеасаблівага сінтэзу літаратурнага твора і вучэбнага дапаможніка, разглядаюцца прыклады беларускіх адукацыйных казак, прысвечаных фарміраванню экалагічнай пісьменнасці, і іх выкарыстанне ў адукацыйным працэсе.*

*Ключавыя словы: літаратурная казка, адукацыйная казка, вучэбны дапаможнік, сторытэлінг, экалагічная пісьменнасць.*

Казка мае складаную жанравую прыроду, якая патрабуе грунтоўнага вывучэння, на што ўказваюць і сучасныя даследаванні [19; 21]. У псіхалогіі выкарыстоўваюцца тэрапеўтычныя [9] (псіхатэрапеўтычныя [22], псіхалагічныя [3]) казкі, а гэта дазваляе сцвярджаць, што творы названага жанру могуць выходзіць за межы літаратурнага працэсу. У кантэксце літаратуры і педагогікі вядуць размову аб дыдактычных казках. Апошнія могуць разумецца шырока – як «павучальныя», а таксама больш вузка – як тэксты, у якіх «“упакоўваецца” вучэбны матэрыял, звязаны з аб'ектамі знешняга свету» [3, с. 47], «адухаўляюцца абстрактныя сімвалы “знешняга” для дзіцяці характару (лічбы, гукі, літары, арыфметычныя дзеянні і т. п.)» [3, с. 47], пры гэтым часам падкрэсліваецца, што дыдактычныя казкі «практычна заўсёды ўтрымліваюць пэўнае заданне вучэбнага характару, якое павінна выканаць дзіця» [3, с. 47].

У адукацыйным, літаратуразнаўчым і культурна-асветніцкім дыскурсах сучаснай Беларусі існуюць падставы для вылучэння такой з'явы, як адукацыйная казка. Пад гэтым тэрміналагічным словазлучэннем мы разумеем мастацка-педагагічны твор, які ўзнік у выніку сінтэзу літаратурнай казкі і вучэбнага дапаможніка і мае на мэце дасягненне пэўных вынікаў у навучанні (засваенне ведаў, набыццё ўменняў і навыкаў, фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заахвочванне да больш глыбокага вывучэння адпаведнай сферы чалавечай дзейнасці). Адукацыйная казка ўключае ў сябе як «дыдактычныя казкі» (у тэрміналагічным значэнні, прапанаваным вышэй), так і шырокі спектр іншых тэкстаў (выданняў), створаных для рэалізацыі канкрэтных адукацыйных задач.

Натуральна, пэўны адукацыйны і пазнаваўчы патэнцыял мае і літаратурная казка, аднак у ёй не прасочваецца намер (інтэнцыя) аўтара распрацаваць мастацка-педагагічны твор адмыслова для яго

выкарыстання ў фармальнай і/ці нефармальнай адукацыі. Адукацыйная казка знаходзіцца паміж двух палюсоў: літаратурны твор – вучэбны дапаможнік. У адносінах да іх кожная канкрэтная рэалізацыя адукацыйнай казкі можа займаць рознае становішча. Адразу адзначым, што ацэнка такога твора (які можа быць вельмі арыгінальным і напісаным на высокім мастацкім узроўні) з літаратуразнаўчых пазіцый павінна ісці непарыўна з улікам пастаўленых перад аўтарам задач навучання, якія могуць дыктаваць арыентацыю на пэўныя схемы, алгарытмы і шаблоны.

Адукацыйная казка можа ўяўляць сабой асобны тэкст ці цэласнае выданне, распрацаванае аўтарам (спецыялістам) адмыслова з мэтамі навучання, а таксама адукацыйны прадукт, створаны вучнем (вучнямі). Маркерамі адпаведных казак, разам з узнікненнем іх у парадыгме адукацыйнага працэсу, з'яўляюцца наступныя:

1) выразнае пазіцыянаванне выдання (у анатацыі ці падчас прасоўвання) як адукацыйнай казкі або казкі-дапаможніка, напрыклад, «Краіна Вымярэнія» [5] А. Грушэцкага і «Матэматычныя казкі-падказкі» А. Якімовіча [26];

2) наяўнасць метадычнага апарату (напрыклад, [27]);

3) распрацаванасць у межах адукацыйных і асветніцкіх праектаў, праграм (напрыклад, [15; 16]);

4) уваходжанне ў кніжную серыю адукацыйнага ці асветніцкага характару (напрыклад, [10; 27]);

5) уключэнне казкі ў дапаможнікі для настаўнікаў і/ці вучняў (напрыклад, [1, с. 116, 119]);

6) шчыльная знітаванасць з навуковымі галінамі і/ці адпаведнымі вучэбнымі прадметамі, напрыклад, матэматыкай (гл. [26]), фінансамі (гл. [15]), лінгвістыкай (гл. [1, с. 116, 119]) і інш.

Пры гэтым адзначым, што адукацыйныя казкі звязаны з такім актуальным напрамкам, як сторытэлінг у адукацыі [4; 6], а таксама могуць сярод іншага несці і рэкламную або брэндавую функцыю.

Літаратурныя казкі аб прыродзе навукоўцы нярэдка ідэнтыфікуюць як прыродазнаўчыя і экалагічныя. У літаратуразнаўстве разглядаліся беларускія ўзоры такіх твораў [8; 20]. Казкі аб прыродзе не абавязкова адносяцца да адукацыйных, бо могуць быць створаны ў рэчышчы літаратурнай традыцыі, уваходзіць у кола літаратурнага чытання дзяцей і не прызначацца наўпрост для выкарыстання ў адукацыйным працэсе па вучэбным прадмеце ці пры вывучэнні пэўнай галіны навукі (але твор можа быць уключаны ў вучэбную праграму па літаратуры). Пры гэтым трэба ўлічваць, што літаратурныя казкі аб прыродзе часта ўтрымліваюць некаторы педагагічны элемент, прадстаўляюць чытачам пэўныя экалагічныя праблемы, аднак гэта адбываецца ў літаратурнай

парадыгме пры адсутнасці маркераў адукацыйнай казкі, апісаных вышэй. Прысутнічаюць выпадкі, калі цяжка адназначна аднесці твор да літаратурнай ці адукацыйнай казкі, што назіраецца і ў тэкстах экалагічнай тэматыкі. Напрыклад, «Каляровая Затока» П. Васючэнкі, з аднаго боку, можа лічыцца сучаснай літаратурнай казкай, з іншага – гэты твор пазіцыянуецца аўтарам як «экалагічная казка», стымулюе чытача да набыцця ведаў, да экалагічных паводзін: «У былую Каляровую Затоку вярнуліся бакаплавы, аўсянікі, трубачнік. (Пачытайце пра іх у кніжках па заалогіі)» [2, с. 136]; «Ты, мой дружа чытач, што б ні рабіў на гэтай Зямлі, памятай, што ёсць у свеце такая істота, далікатная, грацыёзная, гатовая кожнаму дапамагчы, а сама такая безабаронная – Хахуля. Хто ж ёй дапаможа, як не ты?» [2, с. 138].

Даволі актыўна з дапамогай адукацыйнай казкі спрабуюць фарміраваць экалагічную пісьменнасць, пад якой намі, паводле С. Б. Ігнатава, разумеецца «першая ступень у сістэме вынікаў экалагічнай адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця. Крытэрыем яе сфарміраванасці з'яўляецца валоданне неабходным мінімумам экалагічных ведаў, практычных уменняў і навыкаў для арганізацыі экалагічна абгрунтаванай дзейнасці» [7, с. 28]. Звернем увагу на тое, што згаданы даследчык прапаноўвае наступныя ступені: «экалагічная пісьменнасць – экалагічная адукаванасць – экалагічная кампетэнтнасць – экалагічная культура – экалагічная ментальнасць» [7, с. 28]. Стварэнне сусветнай супольнасці з экалагічнай ментальнасцю бачыцца актуальнай праблемай, ад якой залежыць у тым ліку і будучыня чалавецтва.

У адукацыйных казках аўтары імкнуцца прадставіць чытачу веды, звязаныя з экалагічнымі праблемамі, паказаць узор экалагічных паводзін (сфарміраваць пэўныя ўменні і навыкі), стымуляваць да дзейнасці ў адпаведным напрамку (прымяненне ведаў, уменняў і навыкаў на практыцы). Разгледзім некаторыя прыклады адпаведных твораў, якія можна выкарыстоўваць на вучэбных занятках, у пазаўрочнай дзейнасці, для чытання і абмеркавання з вучнямі (выхаванцамі) на адпаведных вучэбных занятках, прысвечаных экалагічнай пісьменнасці.

Спынімся найперш на казках М. Масягінай і мастака В. Кузьміч «Упакоўка шукае сяброў» [16; 18] і «Цікавая вандроўка. Казка пра тое, як старыя рэчы знайшлі новы дом» [17]. У першым творы расказваецца пра падарожжа ўпакоўкі ад магазіна да перапрацоўкі. Чытачы знаёмяцца з праблемай перапрацоўкі смецця і сартыроўкі адходаў. У дадзеным творы яскрава прасочваюцца адукацыйныя задачы: даць базавыя веды аб перапрацоўцы другаснай сыравіны; паказаць чытачу стратэгіі экалагічных паводзін, вартыя выкарыстання. У другой са згаданых казак апавядаецца пра праблему абыходжання са старымі рэчамі, электрычнымі

прыборамі. Выкінутыя на стыхійны сметнік прадметы, якія ствараюць пагрозу адпаведнай экасістэме, не гатовы мірыцца са сваім становішчам і вырашаюць знайсці тое месца, дзе яны павінны апынуцца пасля таго, як сталі непрыдатнымі для выкарыстання. Чытач пры гэтым атрымлівае алгарытм абыходжання з адходамі, у тым ліку небяспечнымі.

У разгледжаных казках вялікую ролю адыгрываюць малюнкі (мастацкае афармленне), якія дапаўняюць казачную атмасферу, заахвочваюць адпаведную узроставую катэгорыю чытачоў да знаёмства з кнігай, падмацоўваюць некаторыя яе палажэнні. Адзначым, што з дапамогай ілюстрацый казачны элемент можа ўводзіцца ў выданні экалагічнай тэматыкі, якія не з’яўляюцца казкамі, напрыклад, «У планеты высокая тэмпература: хто вінаваты і што рабіць?» (паказваецца праблема глабальнага пацяплення) [23; 24], «Экаслоўнічак» («Экословарик») [25].

Прыведзеныя ніжэй кнігі Я. Лаўцюса таксама падпадаюць пад азначэнне адукацыйнай казкі. Да тэмы эфектыўнай энергетыкі, якая шчыльна звязана з экалогіяй, звяртаецца выданне «Па слядах лясных вынаходнікаў» («По следам лесных изобретателей») [11]. У кнізе «Я – твой светлы сябар Атам» («Я – твой светлый друг Атом») [14] праз дыялогі з казачным персанажам Атамам Мендзялеевічам Уранам пяцікласнік Віця атрымлівае веды па атамнай энергетыцы. Эканоміка і экалогія пераплятаюцца ў «Скарбах Гноміка-Эканоміка» («Сокровища Гномика-Экономика») [12], дзе паказваецца, як беражлівасць дапамагае эканоміць і адначасова спрыяе захаванню прыродных багаццяў. У выданні «Рэха зялёнага лесу» («Эхо зеленого леса») [13] распрацоўваецца тэма эфектыўнага абыходжання з адходамі. Свайго роду энергетычную ўтопію ствараюць Я. Лаўцюс і В. Гулько ў творы «Зялёныя клады Энергаграда» («Зеленые клады Энергограда») [10]: хлопчык Андрэй прыязджае да бабулі і дзядулі ў пасёлак Энергаград, дзе напоўніцу выкарыстоўваецца «зялёная» энергетыка.

Адукацыйныя казкі экалагічнай тэматыкі ў якасці адукацыйнага прадукта могуць ствараюцца і вучнямі. Для гэтага мэтазгодна прапанаваць апошнім наступны алгарытм:

1) вызначце, якой экалагічнай праблеме прысвечана казка;
2) пастаўце мэту казкі;
3) вылучце паняцці і/ці з’явы, з якімі знаёміць казка;
4) прыдумайце казачны персанаж;
5) акрэсліце негатыўную сітуацыю, у якой апынуўся прыдуманы персанаж;
6) прапануйце шлях выхаду з негатыўнай сітуацыі, яе выпраўлення;
7) сфармулюйце вывад, які можна зрабіць на аснове пачутай казкі;
8) запішыце казку і адрэдагуйце яе.

Такім чынам, адукацыйная казка мае вялікі патэнцыял у фарміраванні экалагічнай пісьменнасці і найбольш падыходзіць для работы з выхаванцамі ўстаноў дашкольнай адукацыі і вучнямі пачатковых класаў. Адукацыйная казка можа выступаць як мастацка-педагагічны твор, напісаны спецыялістам з мэтай навучання, і як адукацыйны прадукт вучняў. У прааналізаваных творах выкарыстоўваюцца казачныя персанажы і сюжэты, з дапамогай якіх чытачы засвойваюць адпаведныя веды, уменні, навыкі, стратэгіі паводзін. Ілюстрацыю варта лічыць адным са сродкаў увядзення казачнага элемента ў адукацыйны дапаможнік.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / В. П. Красней [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014. – Ч. 1. – 159 с.

2. *Васючэнка, П. В.* Каляровая Затока: экалагічная казка / П. В. Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2008. – 143 с. – (Казкі XXI ст.).

3. *Вачков, И. В.* Сказкотерапия: развитие самосознания через психологическую сказку / И. В. Вачков. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Ось-89, 2007. – 144 с.

4. *Грушевская, В. Ю.* Применение метода цифрового сторителлинга в проектной деятельности учащихся / В. Ю. Грушевская // Педагогическое образование в России. – 2017. – № 6. – С. 38–44.

5. *Грушэцкі, А.* Краіна Вымярэнія / А. Грушэцкі; іл. В. Козел. – Мінск: Кнігазбор, 2019. – 26 с.

6. *Ермолаева, Ж. Е.* Сторрителлинг как педагогическая техника конструирования учебных задач в вузе [Электронный ресурс] / Ж. Е. Ермолаева, О. В. Лапухова // Научно-методический электронный журнал «Концепт». – Режим доступа: https://e-koncept.ru/2016/16132.htm. – Дата доступа: 25.09.2019.

7. *Игнатов, С. Б.* Экологическая компетентность в контексте образования для устойчивого развития / С. Б. Игнатов // Образование и наука. – 2011. – № 1 (80). – С. 22–32.

8. *Караткевіч, В. І.* Асаблівасці вобразнай сістэмы казак Алены Масла (на прыкладзе твораў «Споведзь мёртвай ракі», «Крыўда старога вадзяніка» і «Пацучок Фэлік падарожнічае») / В. І. Караткевіч // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 24–25 крас. 2014 г. / рэдкал.: М. В. Абабурка [і інш.]. – Магілеў, 2014. – С. 343–347.

9. Лабиринт души: терапевтические сказки / под ред. О. В. Хухлаевой, О. Е. Хухлаева. – М.: Академ. проект, 2016. – 175 с.

10. *Лауцюс, Я.* Зеленые клады Энергограда / Я. Лауцюс, В. Гулько. – Минск: Маст. літ., 2013. – 23 с. – (Азбука бережливости).

11. *Лауцюс, Я.* По следам лесных изобретателей / Я. Лауцюс. – Минск: Маст. літ., 2014. – 23 с. – (Азбука бережливости).

12. *Лауцюс, Я.* Сокровища Гномика-Экономика / Я. Лауцюс. – Минск: Дом прессы, 2011. – 24 с.

13. *Лауцюс, Я.* Эхо зеленого леса / Я. Лауцюс. – Мінск: Маст. літ., 2013. – 23 с. – (Азбука бережливости).

14. *Лауцюс, Я.* Я – твой светлый друг Атом: диалоги об атомной энергетике / Я. Лауцюс. – Минск: Адукацыя и выхаванне, 2010. – 44 с.

15. *Ліпскі, У. С.* Грошык і таямнічы кошык: азбука фінансавай граматнасці ад «Беларусбанка» / У. С. Ліпскі. – 3-е выд., стэрэатып. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2019. – 72 с.

16. *Масягіна, М.* Упакоўка шукае сяброў / М. Масягіна; іл. В. Кузьміч. – [Б. м.: б. в., 2014?]. – 14 с.

17. *Масягіна, М. Я.* Цікавая вандроўка: казка пра тое, як старыя рэчы знайшлі новы дом / М. Я. Масягіна; іл. В. Кузьміч. – Мінск: Альтиора Форте, 2017. – 12 с.

18. *Мосягина, М.* Упаковка ищет друзей: экологическая сказка / М. Мосягина; ил. В. Кузьмич. – Минск: Экопартнерство, 2015. – 14 с.

19. *Намычкина, Е. В.* Сказка как литературный жанр / Е. В. Намычкина // Вестн. Вят. гос. ун-та. – 2010. – № 3, т. 2. – С. 103–109.

20. *Полевая, К. В.* Особенности жанра и идейно-художественного содержания современной белорусской литературной сказки о природе / К. В. Полевая // Совр. исслед. социал. проблем. – 2010. – № 4.1. – С. 623–632.

21. *Сухоруков, Е. А.* Соотношение понятий «фольклорная – литературная – авторская сказка» (на примере современных экологических авторских сказок) / Е. А. Сухоруков // Вестн. Москов. гос. лингвист. ун-та. Гуманитар. науки. – 2014. – № 19 (705). – С. 144–151.

22. *Ткачева, Т. Е.* Психотерапевтические сказки для взрослых и детей / Т. Е. Ткачева. – 2-е изд. – Ростов н/Д: Феникс, 2015. – 93 с.

23. У планеты высокая темпертура: кто виноват и что делать? / авт.-сост. А. А. Чумакова, Ю. В. Яблонская, М. А. Хованская; ил. В. Кузьмич; МОО «Экопартнерство». – Минск: [б. и.], 2015. – 23 с.

24. У планеты высокая тэмпература: хто вінаваты і што рабіць? / склад. А. А. Чумакова, Ю. В. Яблонская, М. А. Хаванская; іл. В. Кузьміч; МГА «Экапартнёрства». – Мінск: [б. в.], 2016. – 23 с.

25. Экословарик / сост. Н. А. Андреенко, В. Н. Свистунова; МОО «Экопроект “Партнерство”». – Минск: Позитив-центр, 2014. – 53 с.

26. *Якімовіч, А. М.* Матэматычныя казкі-падказкі / А. М. Якімовіч. – Мінск: Нар. асвета, 2018. – 30 с. – (Бібліятэка Асветыка).

27. *Якімовіч, А. М.* Як Заяц і Воўк сябравалі ды навукі вывучалі: казкі / А. М. Якімовіч. – Мінск: Нар. асвета, 2017. – 44 с. – (Бібліятэка Асветыка).